на базе Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, РНТБ і іншых буйных бібліятэк. Але для гэтага патрэбна з боку рэктарата вызначэнне сродкаў для аплаты супрацоўнікам бібліятэк за той час і працу, якія бібліятэчныя работнікі патрацяць на нашых студэнтаў.

Вось тыя, на наш погляд, некаторыя праблемы, якія патрэбна выраашаць для ўдасканальвання выкладання курса "Бібліятэчныя фонды".

Суддзя Э.С.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ КУРСА "БІБЛІЯГРАФІЯ МАСТАЦТВА"

Курс "Бібліяграфія мастацтва" ўзаемазвязаны з шэрагам як папярэдніх, так і паралельна чытаемых наступных курсаў: "Тэорыя бібліяграфіі", "Кнігазнаўства", "Бібліятэчнае абслугоўванне", "Інфарматыка", "Гісторыя мастацтваў" і інш.

Характар узаемасувязі абумоўлены ступеньчатасцю і бесперапыннасцю адукацыі, г.зн. ідэяй лагічнага, канцэптуальнага і іншага паступальнага назапашвання інтэлектуальных ведаў і набыцця практычных навыкаў.

У значнай меры фарміраванню гэтых ведаў і ўменняў садзейнічае вывучэнне студэнтамі інтэграцыйных працэсаў, якія ахопліваюць сёння ўсе галіны чалавечай дзейнасці, асабліва навуку.

У агульнанавуковым курсе "Гісторыя мастацтваў" даюцца прадстаўленні аб сучасных праблемах навук мастацка-эстэтычнага комплексу, але, на жаль, у гісторыка-мастацкім плане, таму курс "Бібліяграфія мастацтва" не можа абапірацца на багаж ведаў, атрыманых студэнтамі ў гэтым курсе. Па характару і задачах лекцыі і лабараторныя заняткі з некаторай доляй умоўнасці можна падзяліць на азнаямленчыя (пазнавальныя), аналітычныя і творчыя (праблемныя).

Лабараторныя заняткі азнаямленчага характару праводзяцца з мэтай замацавання ў памяці, канкрэтызацыі лекцыйнага матэрыялу, што дае магчымасць студэнту спалучыць веды з курса "Гісторыя мастацтваў" аб асобных стылях, жанрах, творчых асобах.

Адной з тэм, якая разглядаецца ў некалькіх курсах, з'яўляецца тэма аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм па культуры і мастацтву. Размежаванне ідзе па лініі апрацоўкі і выкарыстання мастацтвазнаўчай інфармацыі. Заняткі творчага тыпу разумеюцца намі як заняткі, мэта якіх -- стварэнне новай бібліяграфічнай інфармацыі або пераўтварэнне аднаго тыпу інфармацыі ў другі. На гэтым шляху неабходна цесная сувязь з курсамі "Тэорыя бібліяграфіі", "Арганізацыя бібліяграфічнай работы", "Інфарматыка".

Чытанне курса "Гісторыяграфія мастацтвазнаўства" на факультэце завочнага навучання дазваляе сканцэнтраваць увагу студэнтаў на інтэграцыйным характары інфармацыйных патрэб спецыялістаў у галіне мастацтва і суаднесці іх са стратэгіяй бібліяграфічнага пошуку, які раскрываецца ў курсе "Бібліяграфія мастацтва".

Перспектыўным напрамкам у дасягненні пераемнасці ў перадачы ведаў і ўменняў можа стаць выпрацоўка адзінай метадалогіі навучання, канчатковым вынікам якой стане фарміраванне творчай асобы, каштоўнасць якой на рынку працы даволі высокая.

Для атрымання ступені бакалаўра прапануюцца цыклы тэхналагічных дысцыплін, для атрымання ступені магістра -- курсы, якія ставяць мэтаю выпрацоўку навыкаў самастойнай творчасці.

Прапануецца ўвесці матэрыял па бібліяграфічнаму апісанню выданняў па мастацтву ў курсе "Каталагізацыя мастацкай літаратуры і літаратуры па мастацтву"; аднавіць курс "Гісторыяграфія мастацтвазнаўства" на стацыянары; працягваць работу па перадмашыннай апрацоўцы патокаў і масіву па мастацтву для фарміруемай базы даных для ўводу ў вучэбную АІС.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ